# Якога пантыфіка патрабуе сучасны свет: вобраз біскупа Рыму ў серыяле “*The Young Pope*”

**Аношка Сяргей Анатольевіч,**
Uniwersytet Kardynała Stefana Wyszyńskiego (Warszawa, Polska)

*У кастрычніку 2016 г. адбылася прэм’ера першага сезону італа-французскага серыялу ў рэжысэрыі Паола Сарэнціна пад назваю “Малады Папа” (анг. The Young Pope). У дадзеным тэксце дакананая спроба тэалагічна-культуразнаўчага аналізу змястоўнасці першага сезону гэтае стужкі ў святле сучасных плыняў тэалагічнае навукі.*

Рэлігійная тэматыка ў кінематографе заўсёды мела даволі важкае месца, маўляў, чалавек са сваёй натуры з’яўляецца істотаю рэлігійнаю, таму й ня дзіўна, што нават у хвіліну адпачынку прагне заспакоіць свае духоўныя жаданні. Адною з такіх прапаноў стаў серыял “Малады Папа”, прэм’ера якога адбылася на восень 2016 г. Фільм быў паказаны ў шэрагу еўрапейскіх краінаў, а ў студзені 2017 г. нават у ЗША. Фільмовыя крытыкі часам параўноўваюць новую стужку да вядомага палітычнага серыялу *House of Cards*, але “Малады Папа” з’яўляецца чымсьці большым, чым узгаданы фільм, які, бадай, за свой адпаведнік павінен хутчэй мець *Los Borgia*.

Узгаданы серыял не мае рысаў дакументалістыкі, каб разважаць над ім з пазіцый афіцыйнага Ватыкану. Фільм Сарэнціна з’яўляецца цудоўнаю аповесцю філасофскага кшталту, дзе прысутнічае тэматыка жыцця, улады, веры і духавенства. Але гэта сюжэт таксама й пра манархію, таму фільмам могуць зацікавіцца ў тым ліку невернуючыя. Сюжэтная лінія здаецца быць супрацьпастаўленая сучас-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нае сітуацыі ў каталіцызме з ягоным ліберальным пантыфікатам Францішка (ад 2013 г біскуп Рыму). Праглядаючы фільм, рэжысёр не дае відавочнага адказу: “Малады Папа” – гэта ўхваленне ці крытыка рэформаў, што праводзіць Намеснік Князя Апосталаў у Ватыкане? За дапамогай Касцёла вядзецца гутарка пра сучасны свет увогуле [1, с. 34].

Кім жа ёсьць Малады Папа ва ўзгаданым серыяле? Пантыфік, які абраў сабе інтранізацыйнае імя Пій XIII, быў перад канклавам 47-гадовым кардыналам Лені Беларда са Штатаў. Выхаваны ў дзяцінстве пад апекаю манашкі сястры Мэры (алюзія да Марыі?), абіраецца калегіўм кардыналаў як кампрамісная фігура, але ўжо першыя крокі і захаванне маладога папы выклікаюць шок як у духоўных, так і ў вернікаў. Новы пантыфік слухае дафт панк, на сняданне п’е выключна *Cherry Coke Zero* (звычайную колу, маўляў, лічыць за блюзнерства), паліць ды ходзіць да спартовае залі. Аднак разам з тым сваім кансерватызмам здзіўляе свет й адначасова прыцягвае да сваёй постаці (ужо сам той факт, што абраў сабе імя Пій, сведчыць пра многае)[1]. Адначасова не любіць паказвацца на вочы вернікам і свету, наследуючы традыцыю так званых “вязняў Ватыкану” з перыяду па 1871 г. У фільме ватыканская спецыялістка да спраў PR чуе ад папы “Я ніхто” [2].

Папа Францішак сёння падабаецца амаль усім, ахвотна зробіць *selfie*, усміхнецца журналістам, не асабліва трымаецца дагматычнасці дактрыны, яго любяць нават атэісты. Джуд Лоў (анг. *Jude Law*) у ролі Пія XIII здаецца быць ягонаю анты-версіяю: Касцёл, паводле візіі маладога папы, мае быць хутчэй элітарным, эксклюзіўным клубам, да якога належаць могуць далёка не ўсі ахвочыя. Гэта робіць серыял, які па сутнасці меў быць толькі формаю кінематаграфічнае поп-культуры, даволі глыбокім і разважлівым творам сучаснага мастацтва, што прымушае да рэфлексіі нас, тых хто да Касцёла належыць, але таксама й тых, хто глядзіць на любую рэлігію, як на байку.

Мадэль каталіцызму, прапанаваная Піем XIII, ёсць месцам прытулку для людзей цалкам аддадзеных Богу, тут нямашака месца для наіўных дурняў кшталту “Бог не ў храме, Бог у душы” альбо ліберальных сімпатыкаў лагеру 1968 г. “Я ў Бога веру, але царквы не наведваю”. Такая пастава і шэраг іншых пачынанняў, па фільме, неўзабаве выклікае хвалю незадавальнення ў самім Ватыкане (ці ж бы не намёк на сітуацыю вакол адыходу Бэнэдыкта XVI у 2013 г.?), папа Пій XIII паказаны самотным ды адізаляваным чалавекам, якога нуртуюць унутраныя канфлікты. Новы біскуп Рыму мае знайсці выйсце з сітуацыі, якая па нечым наканаваная ягоным цяжкім дзяцінствам (бацькі-хіпі пакінулі сына ў каталіцкім прытулку) ды траўмамі, перажытымі ўжо падчас святарства.

Сарэнціна ў сваім фільме прапануе нам сваё бачанне тэакратычнае манархіі ўзору XXI стагоддзя, сваю візію каталіцызму, які за гады пантыфікату Францішка становіцца ўсё больш секулярызаваным. Вядомы эфект папы Францішка, так бы мовіць, існуе, але з дакладнасцю наадварот – колькасць вернікаў ды практыкуючых імкліва змяншаецца, а не расце, як тое раней прагнулі даказаць прыхільнікі кард. Берголья[2]. Таму, напэўна, папулярнасць, якою цешыцца серыял у гледачоў, запэўнены не толькі высокім узроўнем густу, з якім зроблены той фільм, але таксама й важным

[1] Паводле негалоснае традыцыі, кардынал абраны на канклаве выбірае сабе імя таго са сваіх папярэднікаў на троне Св. апостала Пятра, чыя духоўная і грамадская палітыка яму была найбліжэйшаю.

[2] Кардынал Jorge Mario Bergoglio (нар. 1936) – уласцівае імя 266-га наступніка Св. апостала Пятра папы Францішка.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

момантам рэфлексіі, чаго, на жаль, часам бракуе сучаснаму кінематографу. “Маладосць” папы сімвалізуе ў ім новую эпоху, адыход былога [1, с. 35].

Рэжысёр імкнецца нам паказаць, што, дзеля таго, каб стаць папам, трэба быць перадусім чалавекам, папства, маўляў, толькі частка нашае істоты як чалавечага гатунку. Менавіта гэтым можа быць вытлумачанае паказанне інтымнае часткі асобы Галавы Касцёла, часам, нават з ламаннем пэўных табу. Няма тут антыклерыкалізму ці атакавання Касцёла, марна дашуквацца тут й гратэскі ў вобразах біскупаў ці кардыналаў. Цалкам наадварот: маем вельмі праніклівы і горкі вобраз сучаснага духавенства, што сказанае на адасабненне, адзіноту ды ўнутраны духоўны дысананс [4].

Але не варта меркаваць, што выключна асоба святара падпадае пад лупу рэжысёра: бачым усё жыццё сучаснага Касцёла разам з працэсамі, што ў ім адбываюцца [3]. І менавіта тут хаваецца прапанова, якая мае быць адчытаная сучасным светам, бо, калі хрысціянства й мае адыграць нейкую адметную ролю ў сучаснае заходняе цывілізацыі, дык варункам таго мусіць быць адпаведная інтэлектуальная і духоўная сумленнасць саміх хрысціянаў, іх пастава адносна ўласнае веры. Сарэнціна ставіць перад намі пытанне: ці сёння веруючы, ці той, хто, веру дэкларуе (такіх у РБ ледзь не 60% [5, с. 39]), дасвядчае часцей Божае прысутнасці ці Яго адсутнасці? Ці вера мае быць адзіным магчымым адказам на пытанні экзістэнцыі ці сама будзе часткаю нашага жыцця, будучы найбольш глыбокім і неспазнаным пытаннем?

Серыял прапануе нам паразважаць, колькі ў сённяшняе духоўнасці мы маем ад сапраўднае веры, а колькі ад лубочных і бліскучых вобразаў, за якімі хаваемся мы, і за якімі хаваем уласную бяздзейнасць і немач? Вобраз Пія ХІІІ з’яўляецца голасам, што заклікае нашае сумленне адказаць на пытанне: “Дзе падзеўся сапраўдны *misterium* ды *sacrum*, дзе нашая вера, у якім стане яна перабывае?” Ці не адкінулі хрысціяне сведчання, якое было дакананае на Крыжы дзве тысячы гадоў таму, замяняючы яго на крыжыкі на шыях ды іконкі святых на “бардачку” нашых аўтамабіляў альбо ў нашых партманэ? Эстэтыка для нас пачала мець большае значэнне за этыку [2].

“Малады Папа” ўводзіць нас у свет парадоксаў, якімі насычанае нашае жыццё ды й сам свет веры. У адной з першых сцэн Пій ХІІІ кажа пра сябе: “Я супярэчнасць, як Бог адзіны ў трох асобах, (...) як чалавек – добры і злы”. Безумоўна, серыял з такою дозаю правакацыі не будзе для кожнага, не прыпадне да густу, мо, й большасці. Чаму так? Адказ відавочны: мы не заўсёды імкнемся стаць перад самімі сабою ў праўдзе, але ж да гэтага нас заахвочваў яшчэ папа-сеньёр Бэнэдыкт XVI. Ці тым самым шляхам вядзе нас медыяльны Францішак, ці ўсё-ткі чакайма на новага пастыра Пія ХІІІ?..

**Літаратура**


1. *Napiorkowski, M.* Nieziemski serial [Тэкст] / M. Napiorkowski // Tygodnik powszechny. – 2016. – 4 grudnia.
2. *Szerszen, N.A.* Wielkie piękno młodego papieża [Тэкст] / N. A. Szerszeń // Teologia polityczna. – 2017. – 13 lutego.
3. *Vincenti, D.* Da „The young pope” al teatro: Silvio Orlando si racconta [Тэкст] / D. Vincenti // Il Giorno. – 2016. – 11 dicembre.
4. *Zalewski, M.* Trzeba mieć mocne nerwy, żeby oglądać „Młodego papieża” / M. Zalewski SJ // Laboratorium Więzi, 02.12.2016 – URL: http://laboratorium.wiez.pl/2016/12/02/trzeba-miec-mocne-nerwy-zeby-ogladac-mlodego-papieza/ (дата доступу: 26.02.2017).
5. *Старостенко, В.В.* Религия и свобода совести в Беларуси : очерки истории : монография / В.В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2011. – 272 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова